# СЯБРАМ—НАШ ВОПЫТ

Гасцінна расчыніліся дзверы нашага універсітэта перад слухачамі факультэта падрыхтоўкі кадраў замежных саюзаў моладзі Вышэйшай камсамольскай школы ЦК ВЛКСМ, якія прыехалі ў нашу рэспубліку для азнаямленчай практыкі.

Кіраўніцтва універсітэта, камітэт камсамола ветліва сустракалі маладых камуністаў з Францыі, ФРГ, Аўстраліі, Заходняга Берліна. Іх віталі прарэктар універсітэта Я. І. Малышаў, намеснік сакратара партыйнай арганізацыі Г. Я. Рылюк, прарэктар па навучанню студэнтаў-іншаземцаў І. П. Чэпа, сакратар камсамольскай арганізацыі універсітэта В. А. Наумовіч і іншыя.

Цэлы дзень госці прысвяцілі знаёмству з універсітэтам, яго структурай, работай розных арганізацый.

З экскурсіямі прайшлі яны па аўдыторыях, кабінетах, чытальных залах, пазнаёміліся з гісторыяй універсітэта.

Усе пытанні, якія цікавілі дэлегатаў, былі асветлены ў шматлікіх выступленнях. Гасцям расказалі аб сістэме навучання студэнтаў у нашым універсітэце, аб структуры камсамольскай і партыйнай арганізацый універсітэта, асноўных напрамках іх работы, узаемасувязі камітэта камсамола з партыйнай і прафсаюзнай арганізацыямі.

Цікавая і змястоўная размова адбылася на кафедры гісторыі КПСС. Таццяна Іванаўна Прытыцкая ў сваім выступленні разгледзела праблемы выкладання грамадскіх дысцыплін, іх уздзеянне на ідэйнае выхаванне студэнтаў.

Вечарам удзельнікі дэлегацыі сустрэліся з камсамольскім актывам, сакратарамі камсамольскіх арганізацый факультэтаў, абмяняліся вопытам работы з моладдзю.

Уручэннем гасцям сувеніраў, выступленнем Народнага ансамбля «Крыжачок» закончылася сустрэча, якая прайшла на высокім ідэйна-палітычным узроўні. Яна павінна дапамагчы яе ўдзельнікам у рашэнні важных практычных задач.

**Л. ДЖЭВАТАВА.**



**— Здольная студэнтка, працавіты, сціплы чалавек, шчодрая, прыгожая душа, — такую характарыстыку вам дасць кожны, хто ведае Людмілу Лабачэўскую, трэцякурсніцу факультэта журналістыкі.**

**Заўсёды цікава слухаць яе адказы на практычных занятках, чытаць своеасаблівыя рэфераты, курсавыя работы Людмілы, выкананыя з глыбокім веданнем тэмы, на аснове ўласных назіранняў.**

**Люда не толькі добра вучыцца, але і актыўна ўдзельнічае ў жыцці курса, факультэта. Яна піша цудоўныя, пранікнёныя вершы, поўныя сапраўднага пачуцця, тонкіх лірычных малюнкаў. Яна і ў жыцці такая ж паэтычная, чулая, узнёслая.**

**Замалёўку аб Людміле Лабачэўскай чытайце на 3-й старонцы.**

**Фота В. ДРАЧОВА.**


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 36 (1072) ● Чацвер, 12 снежня 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.


# ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТБЮРО

Партком універсітэта заслухаў і абмеркаваў пытанне аб кіраўніцтве партыйным бюро гістарычнага факультэта работай студсавета інтэрната № 1.

Паведамленне сакратара партбюро факультэта Э. М. Загарульскага і вынікі праверкі паказалі, што партбюро гістфака мае цесны кантакт са студсаветам, умела арганізоўвае і накіроўвае палітыка - выхаваўчую работу ў інтэрнаце, на сваіх пасяджэннях рэгулярна заслухоўвае пытанні аб рабоце студсавета, справаздачы старшынь прафбюро, каменданта інтэрната, трымае пад кантролем работу ў інтэрнаце камітэта камсамола і прафбюро.

Партбюро мае дакладны і разгорнуты план работы са студсаветам, які ахоплівае розныя аспекты жыцця студэнтаў.

Поспех работы студсавета ў многім залежыць ад яго саставу. Партыйная арганізацыя ўважліва аднеслася да праблемы падбору і расстаноўкі актыву студсавета, дапамагла ў правядзенні справаздачна - выбарнага сходу, арганізавала вучобу членаў студсавета.

Пад кіраўніцтвам партыйнага бюро была праведзена інструктыўная нарада з актывам, на якой вызначаны задачы студэнцкага савета, метады яго работы.

Для аказання пастаяннай дапамогі студсавету партбюро вылучыла шэраг выкладчыкаў - выхавацеляў, даручыўшы гэтую адказную справу вопытным педагогам Н. А. Ганчаровай, Б. А. Мельцару, К. І. Осіпаву. Выхавацелі прысутнічаюць на пасяджэннях студсавета, дапамагаюць планаваць яго работу, удзельнічаюць у арганізацыі вечароў адпачынку і іншых грамадскіх мерапрыемстваў.

У інтэрнаце № 1 існуе строгая прапускная сістэма, добра арганізавана дзяжурства на паверхах, створана і паспяхова працуе аператыўная група ў складзе 9 чалавек.

Кіраўніцтва студсаветам і выхаваўчай работай у цэлым партбюро ажыццяўляе праз студэнтаў-камуністаў, якія жывуць у інтэрнаце.

Як вынік гэтага ўмелага кіраўніцтва — у інтэрнаце добра наладжана палітыка-выхаваўчая работа. Сістэматычна праводзяцца лекцыі, гутаркі са студэнтамі, дыспуты. Толькі за перыяд з 1 кастрычніка па 10 лістапада гэтага года праведзены тэматычныя вечары «Маякоўскі — паэт рэвалюцыі», «Пагаворым аб цудоўным», лекцыі аб міжнародным становішчы, вечар, прысвечаны 57-й гадавіне Вялікага Кастрычніка, і іншыя мерапрыемствы.

Наглядная агітацыя інтэрната добра аформлена. Яна палітычна граматная і адлюстроўвае як жыццё краіны і рэспублікі, так і жыццё інтэрната. У Ленінскім пакоі аформлены стэнды «Партыя Леніна — наш авангард», «Жыццёвы шлях К. Маркса, Ф. Энгельса і У. І. Леніна».

У вестыбюлі інтэрната вывешаны распарадак дня, абавязкі дзяжурнага па паверхах, ля ўваходу — табель санітарнага стану пакояў, план работы студсавета, сацыялістычныя абавязацельствы, спіс саставу студсавета і аператыўнай групы (з указаннем пакояў пражывання), умовы конкурсу на лепшы пакой, розныя памяткі і інструкцыі.

Насценгазета студсавета «Наш быт» выходзіць рэгулярна. У інтэрнаце выпускаюцца «маланкі», якія часта адлюстроўваюць поспехі студэнтаў, іх добрыя ўчынкі.

Арганізаван агляд - конкурс на лепшы пакой.

Нядрэнна наладжана матэрыяльнае забеспячэнне і бытавое абслугоўванне студэнтаў. У інтэрнаце працуюць буфет, пральня, сушылка, кухні. Санітарны стан студэнцкіх пакояў і іншых памяшканняў заслугоўвае добрых адзнак.

Трэба адзначыць, што паміж усімі грамадскімі арганізацыямі інтэрната № 1 існуюць зладжанасць, узаемаразуменне. Немалая заслуга ў гэтым каменданта інтэрната Н. С. Глінскай. Станоўча адбіваецца і тое, што студэнты аднаго факультэта жывуць у асобным інтэрнаце. Гэта ўмацоўвае дысцыпліну, дапамагае падтрымліваць чысціню і парадак.

Добры маральны клімат, цесны ўзаемакантакт у рабоце выхаваўчых арганізацый — вынік правільнага кіраўніцтва студэнцкімі арганізацыямі ў інтэрнаце.

# НА ЖУРФАКУ

## ЖЫВЫЯ СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

У невялікай утульнай кіназале музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сабраліся студэнты ІІ курса факультэта журналістыкі на сустрэчу з былым снайперам Марыяй Іванаўнай Марозавай.

У снежні 1942 года яна была залічана слухачом Цэнтральнай жаночай школы снайпераў, якую скончыла ў чэрвені 1943 года.

М. І. Марозава ўдзельнічала ў баях за вызваленне Беларусі. Медалём «За адвагу» адзначана яе мужнасць у баях пад Оршай. За штурм вышыні 254,1 у раёне возера Сувалкі ў Польшчы Марыя Іванаўна ўзнагароджана ордэнам Славы ІІІ ступені. Тут жа, на тэрыторыі Польшчы, калі загінула камсорг узвода Клава Іванова, Маша ўзяла з рук сяброўкі снайперскую вінтоўку і дайшла з ёю да Прагі.

Медалямі «За перамогу над Германіяй», «За вызваленне Кенігсберга» і многімі юбілейнымі медалямі ўзнагароджана М. І. Марозава.

Звычайная франтавая біяграфія. Адна з мільёнаў тых, якія склалі неўміручы подзвіг народа.

**А. КАМЕНКА.**

## УРОК МАЙСТЭРСТВА

Услед за званком дзверы аўдыторыі расчыніліся— і перад намі апынуліся чатыры чалавекі, для якіх журналістыка ўжо даўно стала звычайнай справай. Гэта былі рэпарцёры М. Бутрымовіч, А. Літвін, В. Някрасаў і Л. Ламсадзе.

Пачаў наш незвычайны урок старшыня секцыі рэпарцёраў Саюза журналістаў М. Бутрымовіч расказам аб сваёй рабоце, цікавых і памятных яе падзеях. Як многа даводзіцца іншы раз прайсці, праляцець, каб убачыць факт сваімі вачыма, няхай нават потым ён зойме ў газеце 10—15 радкоў.

Размову прадоўжыў А. Літвін. Яшчэ двое з нашых сённяшніх «выкладчыкаў» параўнальна маладыя. Мабыць, таму ад іх расказаў павеяла рамантыкай. Загадчык аддзела інфармацыі «Вячэрняга Мінска» В. Някрасаў і карэспандэнт БЕЛТА Л. Ламсадзе расказалі аб усім тым, што нас чакае наперадзе.

Дзве гадзіны былі з намі журналісты, дзяліліся сваім вопытам і ўменнем.

**С. ГЕРАСІМАВА.**

## ПРА СВАЮ ПРАФЕСІЮ

Аб сваёй будучай прафесіі, прафесіі журналіста, студэнты першага курса гаварылі вельмі многа. Нават пісалі сачыненне «Журналістыка. Што гэта такое?». Але, мабыць, лепш за ўсё аб гэтай прафесіі раскажа той, хто прысвяціў ёй шмат гадоў сваёй працы.

Студэнты ІІІ групы пад кіраўніцтвам Таццяны Дзмітрыеўны Арловай нядаўна зрабілі экскурсію ў Агенцтва друку «Навіны». Там перад імі выступілі загадчык аддзела АДН Анатоль Іванавіч Стук і фотакарэспандэнт гэтага агенцтва Уладзімір Ільіч Мяжэвіч. У сваім выступленні Анатоль Іванавіч расказаў аб гісторыі Агенцтва друку «Навіны», аб яго задачах, планах на будучае.

Затым выступіў У. І. Мяжэвіч. Ён пазнаёміў са сваёй працай і работай сваіх калег, адказаў на пытанні студэнтаў. У заключэнне студэнты наведалі фотавыстаўку, прысвечаную нашай рэспубліцы.

**А. ЦЫБУЛЬКА.**

# *СВЯТА БАЛГАРСКІХ СТУДЭНТАЎ*

Кожны год 8 снежня моладзь Балгарскай Народнай Рэспублікі адзначае сваё свята — Дзень студэнта. Устаноўленае яшчэ ў 1903 годзе ў гонар 15-годдзя з дня адкрыцця Сафійскага дзяржаўнага універсітэта, яно стала любімым для ўсёй моладзі рэспублікі.

Павіншаваць балгарскіх сяброў са святам сабраліся ў актавай зале БДУ студэнты і выкладчыкі універсітэта, а таксама нашы замежныя сябры.

Гэта сустрэча—яшчэ адно сведчанне салідарнасці з сябрамі, непарушнасці дружбы паміж нашымі народамі.

**А. РУДНІЦКІ.**

**НА ЗДЫМКУ: балгарскія студэнты ў дзень свайго свята.**



# ШЧЫРАЯ РАЗМОВА

Сёння крыху незвычайны дзень — у нашай групе грамадская атэстацыя.

Пытанне «Што такое атэстацыя?» вось ужо некалькі дзён хвалюе маіх аднакурснікаў. І хаця на дошцы аб'яў вывешана «Палажэнне аб прыёме атэстацыі», але часам можна пачуць у бібліятэцы такую размову:

— Слухай, пра што на атэстацыі пытаюцца? —крыху хвалюючыся, звяртаецца да суседа студэнт другога курса.

— Гутараць пра тваю паспяховасць і грамадскую дзейнасць, — адказвае трэцякурснік.

— Ну, і пра пропускі, вядома, — падказвае яму бывалы студэнт IV курса.

І вось, нарэшце, другакурснікі могуць увачавідкі пераканацца, што ж такое атэстацыя.

Па чарзе чытае камсорг Аляксандр Шукаў атэстацыйныя лісткі студэнтаў 10-й групы. А далей мы пераконваемся, што атэстацыя па сутнасці — гэта шчырая размова паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Кожнаму дадуць яны параду, пажаданне, стараючыся падбадзёрыць пацярпеўшага няўдачу, скажуць «так трымаць» перажыўшаму радасць перамогі.

Вось выходзіць з аўдыторыі Люда Даніленка, якая лічыць, што дасягнуты рубеж яна цяпер ужо абавязкова ўтрымае. Яна спяшаецца падбадзёрыць сяброўак, якія яшчэ чакаюць сваёй чаргі.

— Буду нарошчваць тэмпы, — абяцае выкладчыкам Вольга Макарычава.

— Я буду вучыцца, як браты, — рашае Тамара Шчарбянок, з павагай і любоўю ўспамінаючы сваіх старэйшых братоў - студэнтаў.

— Буду дзейнічаць у навуцы, як і ў спорце, — гаворыць лепшая спартсменка групы Ала Кандуховіч.

Спакойная, разважлівая Надзя Міхневіч сціпла заўважае:

— Я часта губляюся, але спадзяюся, гэта пройдзе.

Усе свае мары, тайны можна даверыць сёння выкладчыкам, бо ведаем, яны зразумеюць, дапамогуць.

— Хачу спяваць у капэле, — з надзеяй у голасе гаворыць Аня Дубавіцкая.

Раіцца наконт выканання сваіх нагрузак Коля Дацік, у якога больш за ўсіх у групе грамадскіх даручэнняў.

Усе сёння гавораць праўдзіва і адкрыта.

Апошнім атэстуецца камсорг нашай групы Аляксандр Шукаў. Потым падводзяцца вынікі. Яны выдатныя: атэставаны ўсе.

Ды ці можа быць у нашай групе інакш?

**І. КУЛЯШОВА,**
**студэнтка матфака.**







**На апошняе пасяджэнне гуртка стылістыкі і літаратурнага рэдагавання да студэнтаў-журналістаў прыйшлі члены СНТ філалагічнага факультэта Мінскага педінстытута імя М. Горкага. Выкладчыкі Л. П. Падгайскі і К. М. Панюціч расказалі аб арганізацыі навуковай работы са студэнтамі, пазнаёмілі з тэмамі, над якімі працуюць будучыя педагогі. Старшыня савета СНТ Н. Кунцэвіч падзялілася вопытам работы.**

**У заключэнне госці запрасілі журналістаў да сябе.**

**НА ЗДЫМКАХ: ідзе сумеснае пасяджэнне.**

**Фота С. ДЗЕЯНКОВА.**

# ДАРОГА ПАД СІЛУ ЎПАРТЫМ

## ДА ПАЧАТКУ ЗАНЯТКАЎ НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ АДДЗЯЛЕННІ

Падрыхтоўчае аддзяленне універсітэта пачало свой шосты вучэбны год.

Сёлета сюды паступіла 225 чалавек, з іх — 99 рабочых, 23 калгаснікі, 103 дэмабілізаваныя з Узброеных Сіл СССР. Сярод залічаных — 72 камуністы, удзельнікі... учарашнія перадавыя рабочыя (больш 20 ударнікаў камуністычнай працы), калгаснікі і выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Многім, даўно скончыўшым школу маладым людзям, падрыхтоўчае аддзяленне дапамагае ажыццявіць сваю мару—вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Адна з іх — будучы гісторык Таццяна Шаройка. Шэсць гадоў працавала яна на Мінскім падшыпнікавым заводзе слесарам, член КПСС, член партбюро цэха і член бюро камітэта камсамола завода. Узнагароджана знакам «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1973 года» і ордэнам «Знак Пашаны», ударнік камуністычнай працы.

Вучыцца ў нас Сцяпан Олех, член КПСС з вытворчым стажам сем год. Да вучобы ў БДУ працаваў вызваленым сакратаром камітэта камсамола калгаса «Рассвет» Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Ён дэпутат Рэчкаўскага сельскага Савета, член выканкома сельсавета, член праўлення калгаса, член бюро райкома камсамола.

Дэмабілізаваны з радоў Узброеных Сіл СССР Анатоль Зябко, кандыдат у члены КПСС, на працягу ўсёй службы ў арміі з'яўляўся выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Быў сакратаром камсамольскай арганізацыі падраздзялення, кіраваў выпускам насценгазеты.

Прынятыя на падрыхтоўчае аддзяленне забяспечваюцца на агульных падставах інтэрнатам, стыпендыяй, карыстаюцца ўсімі правамі студэнтаў, займаюцца ў адных і тых жа аўдыторыях і чытальных залах, удзельнічаюць у шматгранным грамадскім жыцці універсітэта.

Слухачы на занятках на працягу 8 месяцаў пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў будуць паўтараць і вывучаць матэрыялы па праграмах сучаснай сярэдняй школы па тых прадметах, якія вынесены на уступныя экзамены. Але задача, якая стаіць перад аддзяленнем, не толькі ў паўтарэнні і вывучэнні, а галоўнае, у падрыхтоўцы слухачоў да інтэнсіўнай вучобы ва універсітэце, да лекцыйна-семінарскай сістэмы заняткаў, да работы з кнігамі, да хуткага пошуку і перапрацоўкі багатай інфармацыі.

Пяцігадовы вопыт работы падрыхтоўчага аддзялення паказвае, што паспяховая вучоба слухачоў залежыць у асноўным ад таго, наколькі вялікае ў кожнага з іх жаданне вучыцца, сіла волі і арганізаванасць для дасягнення пастаўленай мэты. Працалюбства — галоўны талент чалавека, дзякуючы яму можна пераадольваць любыя цяжкасці і падняцца да вяршынь патрэбных ведаў.

**М. ЧУДАЕЎ.**

# ПРАЦУЕ КАБІНЕТ

У верасні гэтага года па рашэнню камісіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР пры універсітэце пачаў працаваць вучэбна-метадычны кабінет. З асноўнымі напрамкамі яго работы, планамі на будучае знаёміць нас загадчык кабінета Міхаіл Лявонцьевіч Бараздоў.

**— Міхаіл Лявонцьевіч, раскажыце аб мэтах работы вашага вучэбна-метадычнага кабінета.**

— Калі гаварыць у шырокім сэнсе—гэта каардынацыя і распрацоўка мерапрыемстваў па далейшаму ўдасканаленню і павышэнню якасці вучэбнага працэсу. Такім чынам, кабінет з'яўляецца цэнтрам абагульнення лепшага вопыту прафесарска - выкладчыцка г а саставу кафедр універсітэта. Куратары і выкладчыкі могуць атрымаць тут патрэбныя парады.

Усёй работай кабінета кіруе вучэбна-метадычны савет універсітэта.

**— Як вырашаюцца ў вас пытанні навуковай работы?**

— Навуковыя працы, рэфераты перш за ўсё абмяркоўваюцца на сумесных пасяджэннях нашага кабінета. Затым прадстаўляюцца ў вучэбна-метадычны навуковы савет універсітэта. Тут непасрэдна ставіцца пытанне аб публікацыі, выхадзе ў друк той ці іншай працы.

**— З якімі ВНУ рэспублікі, краіны вы падтрымліваеце сувязі?**

Метадычны кабінет нашага універсітэта трымае сувязі з Гомельскім, Саратаўскім універсітэтамі. У далейшым думаем сувязі гэтыя расшыраць. **А. ДАДАЛКА.**

# ВАЖАК ГРУПЫ

Яшчэ школьніцай Вольга Касцюкова прывыкла выконваць камсамольскія даручэнні без адгаворак, своечасова. Ды і наогул які ж ты камсамолец, калі не цікавішся жыццём і справамі сяброў. Усё гэта спатрэбілася дзяўчыне і ва універсітэце. Стаўшы тры гады таму назад студэнткай факультэта прыкладной матэматыкі, яна ніколі не адмаўлялася ад грамадскіх даручэнняў, ахвотна выконвала іх, што не перашкаджала Вользе добра вучыцца і заўсёды прыходзіць на дапамогу тым, каму гэтая дапамога была патрэбна.

Мабыць таму ў мінулым годзе на справаздачна-выбарным сходзе камсамольцы групы прапанавалі выбраць камсоргам менавіта Вольгу.

— Ці спраўлюся я?.. — неяк засумнявалася дзяўчына.

— Спатрэбіцца дапамога — звяртайся ў камітэт, — прагучала ў адказ.

З гэтага моманту спраў у дзяўчыны прыбавілася. Ды яшчэ змяніўся састаў камсамольцаў групы. І да кожнага трэба знайсці падыход, справу па душы. Аднак не дарэмна кажуць у народзе, што калі захочаш, дык і горы павернеш. Тым больш, калі зацікаўлены ў гэтым. І сапраўды, Касцюкова змагла знайсці ключык да кожнага. Правяла сход, абмеркавалі план работы, завяла гутарку аб лепшым выкарыстанні вольнага часу.

Прапановы сяброў дапамаглі ў рабоце. Мерапрыемствы планавала так, каб ад іх была найбольшая карысць. Вялікую ўвагу звяртала на вучобу, дысцыпліну, наведванне заняткаў. Калі ў групе хто - небудзь прапускаў лекцыі ці практычныя заняткі, адразу выяўлялі прычыну, строга размаўлялі з прагульшчыкамі. Усё гэта дало вынікі: сесія была здадзена паспяхова.

У гэтым годзе Вольга — зноў камсорг.

— Падабаецца быць з сябрамі, цікава. Тым больш, калі ў групе такія цудоўныя юнакі і дзяўчаты, — гаворыць яна.

Сапраўды група добрая. Яна падрыхтавала і правяла для ўсяго факультэта гутарку на тэму «Аб ідэалагічнай дыверсіі імперыялізму і павышэнні пільнасці савецкіх людзей». Перыядычна, адзін раз у два тыдні, арганізоўваюцца палітінфармацыі, праведзен камсамольскі сход, на якім ставілася пытанне аб абмене камсамольскіх дакументаў, прымаліся асабістыя абавязацельствы.

Разам з гэтым праводзяцца культпаходы ў музеі, тэатры. Група актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы і правядзенні факультэцкіх мерапрыемстваў. І заўсёды арганізатар цікавых спраў — камсорг Вольга Касцюкова.

— Вольга — добры, чулы і строгі таварыш, — гавораць яе аднакурснікі Віктар Чэканскі і Уладзімір Шылкін, — нікога не абыдзе ўвагай, заўсёды дапаможа. Вось за гэта і паважаем яе.

**Т. ГРЫНЦЭВІЧ.**

# СТУДЭНТУ—ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦЫ

Мы з'яўляемся сведкамі і ўдзельнікамі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, якая адбываецца ў цяперашні час. Яна нараджае гіганцкі інфармацыйны паток. Авалоданне ведамі, здабытымі навукай, і з'яўляецца адной з задач навучання. Французскі публіцыст М. Рузе адзначае ў сваёй кнізе «Роберт Апенгеймер і атамная бомба»: «Быў час, калі сума новых ведаў, атрыманых навукай на працягу жыцця аднаго чалавека, складала 10—20 працэнтаў ад тых дадатковых ведаў, якія можа набыць дарослы чалавек у дадатак да атрыманай у маладосці сярэдняй адукацыі; цяпер суадносіны змяніліся і складаюць некалькі соцень працэнтаў».

Здавалася б, што працэс набыцця ведаў з'яўляецца калі не дарэмным (нельга ахапіць неабдымнае), то па крайняй меры некіруемым. Аднак калі падысці да гэтай праблемы больш аптымістычна, то няцяжка прыкмеціць, што мы ўступаем у якасна новую паласу, дзе назіраецца супярэчнасць паміж старымі формамі і метадамі навучання і новым зместам вучэбнай інфармацыі, да таго ж са значна большым яе аб'ёмам.

Рашыць гэтую супярэчнасць і павінна навуковая арганізацыя працы. Ва ўмовах студэнцкай работы гэта задача фармулюецца як правядзенне форм і метадаў навучання ў адпаведнасці з новым зместам вучэбнай інфармацыі, з павелічэннем яе аб'ёму. Пры гэтым неабходна мець на ўвазе, што студэнт — не пасіўны аб'ект навучання, а найбольш актыўны яго элемент. І эфектыўнасць навучання будзе залежаць ад таго, наколькі вялікім будзе жаданне студэнта набыць неабходную інфармацыю. Не лектар павінен навучыць студэнта, а студэнт абавязан узяць неабходныя веды з лекцыі.

Вядома, студэнт, які ўпершыню ўвайшоў у сцены ВНУ, не ў стане адразу авалодаць нават метадамі набыцця ведаў. Іншымі словамі, першакурснік адаптуецца ва ўмовах студэнцкага жыцця. Працэс гэты ідзе на працягу некалькіх гадоў, і ад яго вынікаў залежыць, наколькі поўна студэнт сфарміруецца як спецыяліст і як асоба.

Каб паскорыць і якасна ўзбагаціць працэс адаптацыі студэнтаў да іх будучай спецыяльнасці, у гэтым годзе на фізічным факультэце чытаецца новы курс —«Уводзіны... Увядзенне ў спецыяльнасць». Задача яго — навучыць першакурснікаў самастойна працаваць з вялікай эфектыўнасцю. Але гэтага мала. Патрэбна яшчэ працаваць сістэматычна, паколькі сістэматычная праца з'яўляецца залогам значных поспехаў у вучобе. Студэнты пазнаёміліся з элементамі сацыяльнай псіхалогіі, псіхалагічнымі аспектамі навучання, набылі веды па рацыянальнай арганізацыі разумовай працы, рэжыму дня, гігіены працы, пазнаёміліся са спецыфікай работы шэрагу кафедр.

Несумненна, што ўвядзенне гэтага курса своечасовае; веды дапамогуць студэнтам захаваць добрую працаздольнасць не толькі на працягу семестра, але і ў ходзе сесіі.

**В. НАВУМЧЫК.**





*Што за студэнт без бібліятэкі, гэтай цудоўнай кладоўкі строга разгалінаваных і ўпарадкаваных ведаў?!*

*З самага ранку цягнецца сюды чародка засяроджаных і сур'ёзных юнакоў, дзяўчат, а ў час сесіі — цэлая армія прагнучых ведаў. Але і тады тут усё тыя ж цішыня і парадак: ніхто і ніхто не павінен перашкаджаць студэнту займацца.*

*Наш фотакарэспандэнт Сяргей ДЗЕЯНКОЎ пабываў у бібліятэцы галоўнага корпуса, у яе чытальных залах. Амаль ніхто са студэнтаў і не заўважыў яго: дзе тут убачыш што-небудзь, акрамя асабістай кніжкі! Калі «гарыць» даклад ці кантрольная, няма справы ні да прыгажосці кветак, што стаяць на сталах, ні да геаметрычнай стройнасці кніжных стэлажоў. Між тым, усё гэта зроблена бібліятэкарамі, незаменнымі памочнікамі, дарадчыкамі студэнта.*

МАЯ СЯБРОЎКА

# «...Я ВЫБЕРУ СНЕГАПАД»

ЛЁГКАЕ шапаценне цэлафану, і ў глінянай вазачцы з'явіліся белыя стройныя хрызантэмы. У адну хвіліну ажыў, неяк па-новаму непазнавальна змяніўся пакой.

— Ой, дзяўчаты, гляньце, як там прыгожа! Бяжым! — ускліюнула Люда, паказваючы на акно.

На пушыстай шапачцы, на веїках сяброўкі зіхацяць бліскучыя вясёлыя кропелькі, падобныя на кропелькі расы. І ўся яна радасная, усхваляваная, дыхае свежасцю, маладосцю.

Першы снег... Пушыстыя белыя камячкі плаўна і павольна падаюць на асфальт. Люда падстаўляе далоні, пачынае кружыцца, напяваючы вальс Шапэна. Потым спыняецца:

—А памятаеце, у Багдановіча:

Будзь жа век маладым,
Поўны светлымі днямі!
Пралятайце, гады,
Залатымі агнямі!

А вы? Не паспелі з заняткаў вярнуцца — і насы ў кніжку.

...Існуе думка, што гады студэнцтва запамінаюцца надоўга, на ўсё жыццё. Гэта звязана з успамінамі цікавых паходаў у тэатр, гутаркамі ля вогнішча, студэнцкімі вечарамі, з сябрамі... Надоўга запомніцца мне гэты першы снег, мая сяброўка.

У «Інтэрв'ю з выдатнікамі» — гэта стэнд лепшых студэнтаў журфака — Люда Лабачэўская сказала: «Калі мне давядзецца выбіраць паміж «чыталкай» і снегападам — я выберу снегапад».

Многія палічылі гэта за жарт. Я зразумела словы крыху інакш, бо ў іх закладзен сэнс характару сяброўкі.

— Галоўнае, свой час спланаваць так, каб паспець зрабіць многае. І, канешне, настойлівасць, воля,—прызнаецца Люда.

Выдатнікі бываюць розныя. Адны на калідоры інтэрната ўслых «стракочуць» філасофію, завучваючы чужыя думкі. Другія ж аналізуюць гэта на канкрэтных прыкладах жыцця, дапаўняюць яго ўласнымі назіраннямі, разважаннямі. Яны паспяваюць пабываць усюды: на заводзе, у кіно, тэатры, адстаяць гонар факультэта на спартыўных спаборніцтвах і г. д. Люба Лабачэўская адносіцца да гэтай апошняй катэгорыі студэнтаў.

Прыемна слухаць і яе адказы на практычных і семінарскіх занятках. Зусім нядаўна, напрыклад, яна падрыхтавала цікавы даклад пра творчасць Аркадзя Куляшова: свае думкі, прыклады, свой асабісты аналіз твораў. А па яе вачах было бачна, што дзяўчына ўклала душу ў справу.

А хто разам з ёй працаваў на сельскагаспадарчых работах, безумоўна, запомніў Людку-повара. Дужа смачныя абеды рыхтавала Лабачэўская.

А яшчэ яна любіць спорт. Яе спартыўным спрытам мы захапляліся не толькі на занятках па спартыўнай гімнастыцы, але і на кросе.

Ні адно мерапрыемства не праходзіць без актыўнага ўдзелу Люды. На нашым трэцім курсе яе паважаюць. Люда — член камсамольскага бюро курса, прафорг другой групы. І пры ўсім гэтым застаецца шчырым, простым, спагадлівым, добрым таварышам. А пазнаючы добрае, прыгожае вакол сябе, мы самі становімся лепшымі і прыгажэйшымі.

**Л. МІХАЛЕВІЧ,**
студэнтка.

ПРАКТЫКА

# БАЙКАЛЬСКІЯ МАРШРУТЫ

Лета для студэнтаў геаграфічнага факультэта — гэта пара захапляючых падарожжаў па бязмежных прасторах нашай Радзімы. Адны накіроўваюцца ў далёкія маршруты па маляўнічых Карпатах, іншыя — у азёрны карэльскі край, трэція— па сцежках старажытнага Урала.

Нашай групе давялося пазнаёміцца з самабытнай першароднай прыродай Прыбайкалля і з адным з найвялікшых азёраў зямнога шара Байкалам. У апошнія гады ўвага да гэтага здзіўляючага возера асабліва ўзрастае. Байкал уцягнут у кола вялікіх праблем асваення прыродных багаццяў Сібіры.

Пастаянныя назіранні над жыццём Байкала пачаліся ў 1919 годзе, калі непадалёку ад пасёлка Вялікія Каты на беразе паўднёвага Байкала была створана экспедыцыйная база Акадэміі навук, а ў 1928 годзе ў Ліствянцы — Байкальская біялагічная станцыя.

На станцыі працавала ўсяго некалькі чалавек. Пад кіраўніцтвам Г. Ю. Верашчагіна яны вывучалі ледзяное покрыва возера, яго трываласць, здольнасць прапускаць сонечныя промні і перадаваць цяпло. Верашчагін склаў карту глыбінь возера. Таленавіты вучоны ўсё сваё жыццё прысвяціў вывучэнню Байкала.

Паступова расла колькасць задач, якія рашаліся Байкальскай станцыяй. У 1961 годзе яна была перабудавана ў інстытут. Зараз у ім працуюць географы, геолагі, батанікі, заолагі, кліматолагі, біёлагі і метэаролагі. Яны вывучаюць прыроду возера, яго берагоў — увесь байкальскі прыродны комплекс. Дзесяткі розных экспедыцый збіраюць каштоўны навуковы матэрыял.

У адной з такіх навуковых экспедыцый удзельнічалі і мы, студэнты геаграфічнага факультэта.

Мэта экспедыцыі — вывучэнне мікракліматычных асаблівасцей на поўдні Байкала, абумоўленых уздзеяннем брызаў і горнадалінавых вятроў. Метэаназіранні праводзіліся ў раёне г. Байкальска. Вынікі даследаванняў маюць вялікае значэнне для высвятлення ўзаемаадносін паміж прыродай і гаспадарчай дзейнасцю мясцовага насельніцтва.

Мы пазнаёміліся з прыродай часткі Байкала — назіранні праводзіліся не толькі на поўдні Байкала, але і на Ушканых астравах, у адкрытым Байкале з борта навукова-даследчага судна «Верашчагін». Суровая і амаль некранутая прырода возера і яго берагоў нас зачаравала. Блакітна-зялёная гладзь вады з усіх бакоў акружана горнымі хрыбтамі, ледзь не цэлы год пакрытымі снежнай шапкай.

Ушканы астравы — адно з самых цудоўных месц на Байкале. У склад Ушканьяга архіпелага ўваходзяць чатыры астравы — Вялікі, Доўгі, Круглы і Тонкі.

На астравах мы займаліся вывучэннем сонечнай радыяцыі, уплывам сонца на фарміраванне мясцовых ландшафтаў.

Апрацоўка гэтых даследаванняў дазваляе даць адказ на многія пытанні, якія звязаны са своеасаблівасцю прыроды астравоў.

Мы расталіся з Байкалам ненадоўга. Наступным летам зноў адправімся ў экспедыцыю вывучаць прыродны комплекс гэтага унікальнага возера. Наперадзе яшчэ многа сустрэч, хвалянняў, уражанняў.

**В. ДЗЕМ'ЯНЮК,**
студэнт.

# 28 ДЗЁН У ГДР

Кожнае студэнцкае лета застаецца надоўга ў памяці. Мне ж больш за ўсё запомнілася мінулае, калі я стала байцом інтэрнацыянальнага студэнцкага будаўнічага атрада, што выязджаў у ГДР.

У Берліне нас сустракалі нашы будучыя перакладчыкі Вільфрыд і Роз-Мары. Яны і суправаджалі нас да месца будучай работы — у Брандэнбург. Там нас ужо чакалі студэнты з Балгарыі. Яны прыехалі на дзень раней і адчувалі сябе, як дома. Забягаючы наперад, магу сказаць, што менавіта з гэтым атрадам з Плоўдзіўскага універсітэта ў нас завязаліся самыя сяброўскія адносіны.

У Брандэнбургу мы размясціліся ў інтэрнаце будаўніча-мантажнага ўпраўлення. Разам з намі жылі атрады студэнтаў з НРБ, ПНР, ЧССР, ВНР, ГДР. Усе мы ўваходзілі ў склад інтэрнацыянальнага атрада і жылі адзіным калектывам па агульнаму распарадку дня.

Нам выпаў гонар працаваць у юбілейны год — год 25-й гадавіны ўтварэння ГДР. Усе байцы нашага атрада адносіліся да работы добрасумленна. У выніку атрымалася, што мы выканалі свой працоўны план на 158 працэнтаў.

Вельмі добрыя водгукі нам давялося пачуць аб адносінах да працы і маральных якасцях байцоў нашага атрада ад нямецкіх рабочых. Сярод іх у нас таксама было многа сяброў, якія заўсёды дапамагалі нам, растлумачвалі вытворчыя пытанні. Няведанне мовы не было ні для нас, ні для іх перашкодай — мы добра разумелі адзін аднаго.

Дырэкцыя прадпрыемства, на якім нам давялося працаваць, накіравала да нас, ва універсітэт, пісьмо з падзякай за нашу работу.

Мы афармілі чырвоны куток па месцу свайго жыхарства. Тут знаходзілася наша атрадная газета, падборка кніг У. І. Леніна, кіраўнікоў КПСС і Савецкай дзяржавы, літаратура аб Беларусі і подзвігу яе народа ў час Вялікай Айчыннай вайны, аб яе поспехах у сацыялістычным будаўніцтве. Па ініцыятыве нашага атрада быў праведзен вечар, на якім мы расказалі аб XVII з'ездзе ВЛКСМ.

Многа часу ў лагеры адводзілася спорту. Мы ўдзельнічалі ў сустрэчах па валейболу, футболу, тэнісу. Вельмі запомнілася спартыўнае свята, дзе мы паказалі нядрэнныя вынікі. Па валейболу нашы дзяўчаты занялі І месца, па футболу юнакі — II.

З першых дзён нашага знаходжання ў лагеры мы наладзілі цесныя кантакты з атрадамі студэнтаў іншых краін сацыялізму. Дапамагалі ў гэтым і вечары дружбы.

За дні работы ў Брандэнбургу ў нас паявілася многа сяброў з Балгарыі, Польшчы, ГДР, Чэхаславакіі і Венгрыі.

У канцы працоўнага семестра былі падведзены вынікі нашай работы. Мы раздзялілі І—ІІ месцы з атрадам студэнтаў Плоўдзіўскага універсітэта.

Сумна было ўсім нам развітвацца з сябрамі, але наперадзе нас чакала паездка па краіне, сустрэчы з новымі гарадамі і новымі людзьмі.

Першым горадам, які мы наведалі, быў Патсдам.

Дзень выдаўся цудоўны, і мы з задавальненнем хадзілі па парку Сан-Сусі, любаваліся яго фантанамі і палацамі.

Сталіца ГДР сустрэла нас дажджом, але гэта не перашкодзіла нам пазнаёміцца з Берлінам. З тэлевышкі мы агледзелі ўвесь горад. Пабывалі ў музеях, пастаялі каля Брандэнбургскіх варот, наведалі Трэптаў-парк.

У Дрэздэне мы былі два дні. Агледзелі Цвінгер — сховішча музейных каштоўнасцей, наведалі вядомую карцінную галерэю.

У Лейпцыгу агледзелі Дом-музей, дзе друкаваўся першы нумар ленінскай «Іскры», былі каля помніка Бітвы народаў (1814 г.).

Гэтую паездку я не забуду ніколі.

**Т. КАРПАВА,**
студэнтка гістфака.

НА КАФЕДРАХ, У ЛАБАРАТОРЫЯХ

# З УДЗЕЛАМ СТУДЭНТАЎ

Як правіла, даследаванні, якія вядуць лабараторыі і кафедры нашага універсітэта, вельмі важныя для народнай гаспадаркі. Адносіцца гэта і да лабараторыі бактэрыялогіі і вірусалогіі біяфака. Па гаспадарчаму дагавору, заключанаму год назад з Угліцкім інстытутам маслаframework робства і сыраробства, яе калектыў працуе зараз над тэмай «Вывучэнне бактэрыяфагаў малочнакіслых стрэптакокаў і ўмоў, якія ўплываюць на іх развіццё».

Навукова - даследчая група лабараторыі шукае спосабы барацьбы з вірусамі малочнакіслых бактэрый, вельмі важных у малочнай прамысловасці. Бо без іх, як вядома, малако не можа скіснуць.

Да работы прыцягваюцца студэнты факультэта. Аб гэтым расказвае адзін з кіраўнікоў работы асістэнт кафедры мікрабіялогіі А. Н. Сельскоў:

— Для студэнтаў лабараторыя дае перш за ўсё магчымасць папрацаваць над канкрэтным заданнем, якое мае прамысловае значэнне. Безумоўна, усведамленне рэальнай карысці сваёй справы значна павышае іх зацікаўленасць.

— А вынікі?

— Калі канкрэтна, то па тэме гэтага дагавору ўжо напісаны і з поспехам абаронены тры курсавыя і тры дыпломныя работы. Акрамя таго, студэнты атрымліваюць вялікія практычныя навыкі. Зараз у лабараторыі працуе група з шасці чалавек — студэнты другога — пятага курсаў. Прыйшлі яны сюды самі і працуюць так, што папракнуць іх ні ў чым я не магу. Вось, напрыклад, Віктар Шчэрба, студэнт чацвёртага курса. Ён шчыра зацікаўлен нашай тэмай. Зараз я падлічваю, колькі часу ён праводзіць у лабараторыі — самому цікава... У сярэднім 25—30 гадзін у тыдзень. І гэта пасля лекцый.

Амаль кожны з членаў менавіта так адносіцца да работы. Задача ж вельмі адказная — дапамагчы знізіць страты малака на заводах, дзе з'явіліся бактэрыяфагі.

**С. КРАПІВІН,**
**студэнт журфака.**



**На здымку:** студэнт IV курса біяфака Віктар **Шчэрба** ў лабараторыі бактэрыялогіі і вірусалогіі.

Фота **аўтара.**

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА



## МЕЛОДИЯ

К. СТАЛЯРЧУК

*Неслась, как вечный, чистый водопад,*
*Текла, лилась мелодия ручьями*
*И обрывалась быстрыми лучами,*
*И забывала отступить назад...*

*Играл оркестр.*
*Стремительно плыло*
*На струнах скрипок*
*«Вечное движенье».*
*И мысль рождала тихое волненье,*
*И становилось в сумраке светло.*

*

**Осыпаются звёздами росы**
**И, звенящие, будят рассвет,**
**И берёзы игривые косы**
**Окунают в нахлынувший свет.**
**Завлекаются ветры в бессонье,**
**Поднимая зарю на огнях...**
**И блестят позолотой червоной**
**Налитые хлеба на полях.**
**Я шагаю за песней рассвета,**
**Что поёт удивительно лес.**
**За последними тайнами Лета.**

## Іосіф Кабзон: «ПЕСНЯ—МОЙ СПАДАРОЖНІК»

У фестывалі мастацтваў народаў СССР «Беларуская музычная восень» прыняў удзел лаўрэат многіх конкурсаў, заслужаны артыст РСФСР, народны артыст Дагестанскай АССР Іосіф **Кабзон.** З поспехам прайшлі яго канцэрты ў Мінскім Палацы спорту.

**— Іосіф Давыдавіч, як Вы прыйшлі на эстраду?**

— У маіх словах не будзе нічога новага: як і ўсе, спяваў у мастацкай самадзейнасці. Потым — служба ў арміі, у час якой прыняў удзел у рэспубліканскім конкурсе песні ў Тбілісі і атрымаў прэмію. Мяне запрасілі ў ансамбль песні і танца Закаўказскай ваеннай акругі. Тут я адчуў, што менавіта песня — мой спадарожнік у жыцці. Пасля заканчэння вучылішча імя Гнесіных — увесь час на сцэне.

**— У Вашым рэпертуары песні лірычныя, патрыятычныя, грамадзянскія. Што вам больш да спадобы?**



— Гаворачы аб лірычнай песні, трэба адзначыць, што яна не заўсёды знаходзіць шлях да сэрцаў слухачоў. Сустракаюцца песні са слабым тэкстам, і нават музыка ў такім выпадку не можа даць ім доўгае жыццё.

Добра, на мой погляд, успрымаюцца песні патрыятычнага, грамадзянскага гучання. Сваю перавагу вось ужо на працягу пятнаццаці год я аддаю ім. Папулярнасць іх у гледача абумоўліваецца зваротам да песні такіх таленавітых паэтаў, як Р. Гамзатаў, Р. Раждзественскі, Я. Далматоўскі, Я. Еўтушэнка. Палюбіць песню дапамагаюць іх пранікнёныя вершы.

**— Якое пачуццё авалодвае Вамі, калі даручаюць першаму данесці твор да слухача?**

— Вельмі прыемна, але ў той жа час і адказна. Гэта дзецішча кампазітара і паэта трэба не толькі «выкарміць»; трэба яго «вырасціць» прыгожым і гарманічным. Канешне, такія песні, як «За таго хлопца» М. Фрадкіна, «Жураўы» Я. Фрэнкеля, песня М. Тарывердзіева з тэлефільма «Семнаццаць імгненняў вясны» — іх я выканаў на сцэне першым. — мне асабліва дарагія і памятныя.

**— Фестываль «Беларуская музычная восень» праводзіўся ўпершыню. Што Вы можаце сказаць аб ім?**

— Арганізацыя фестывалю наогул нядрэнная. Невялікая колькасць выканаўцаў-салістаў кампенсавалася выступленнямі ансамбляў «Сінтэз», «Смерычка», «Балтыйскія чайкі», «Вана Таомас». Асабіста мне спадабалася «Смерычка». Любімы ж мой вакальна-інструментальны ансамбль — «Песняры».

У Мінск я прыязджаю чацвёрты раз; з горадам і яго гасціннымі жыхарамі ўжо крыху знаёмы. Сёлета хачу сваімі вачыма ўбачыць Хатынь...

Гутарку вёў **М. ЖУРАВОВІЧ,** студэнт II курса факультэта журналістыкі.
Фота аўтара.

## ...І РАСКРЫВАЕЦЦА СКАРБНІЦА

Не будзем гаварыць, што гэта было завочнае падарожжа па надзвычай цікаваму гораду. Гэта была лекцыя. Але лекцыя — цудоўная!

Мінская гарадская арганізацыя таварыства «Веды» разам з Дзяржаўным ордэна Леніна Эрмітажам арганізавалі цыкл лекцый «Буйнейшыя музеі свету». Кожны месяц чытаецца адна з іх у нас ва універсітэце.

Мастацкія скарбы Італіі... Нават думка аб іх прымушае хутчэй біцца сэрцы аматараў архітэктуры, скульптуры, жывапісу. І вось чарговая лекцыя дазваляе нам сустрэцца, пазнаёміцца бліжэй з музеямі Рыма. Паўней уявіць сабе гэты стаўшы жывой легендай горад дапамаглі чорна-белыя і каляровыя дыяпазітывы, якія паказваліся на працягу ўсёй лекцыі.

Рым антычны... Форум — плошча - музей пад адкрытым небам. У II—I стагоддзях да нашай эры тут быў цэнтр грамадскага і палітычнага жыцця старажытнага Рыма. Калізей, Калона імператара Траяна, храм усіх багоў Пантэон, арка Ціта, Музей тэрм, у якім захоўваюцца сусветна вядомая статуя Мірона «Дыскабол» і трон Людавізі (алтар Афрадзіты), на якім адлюстравана нараджэнне з марской пены ўсмешкалюбівай багіні. Дарэчы, зусім нядаўна ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР мы бачылі злепак гэтай работы, зроблены Н. Лежэ...

Лекцыя дазволіла нам яшчэ раз сустрэцца з кожным з гэтых цудаў.

А потым Рым ранняга сярэдневякоўя: пабудовы, мазаікі, фрэскі...

Рым эпохі Адраджэння: першы ў Еўропе публічны музей на Капіталійскім узгорку і Капіталійская плошча, якую аформіў у XVI стагоддзі сам Мікеланджэла.

Адна з цікавых старонак лекцыі — музеі і храмы Ватыкана, якія ўвабралі ў сябе роспісы Рафаэля і Мікеланджэла, работы Леанарда да Вінчы.

Ішла гаворка пра работы Тыцыяна, Караваджа і так аж да мастакоў XX века, работы якіх найбольш поўна прадстаўлены ў Музеі сучаснага мастацтва.

Рым — Вечны горад, у абліччы якога сутыкнуліся і побач існуюць матывы антычнасці, сучаснасці, эпохі Адраджэння,—раскрыў перад намі скарбніцу свайго мастацтва. А наперадзе яшчэ сустрэчы з Афінамі і Фларэнцыяй, Лонданам, Дрэздэнам, Парыжам, у музеі якіх павядуць нас экскурсаводы-лектары.

**Т. АБРАМОВІЧ.**

## АЦЭНКА ТВОРЧАЙ ПРАЦЫ

Дацэнт кафедры беларускай літаратуры Ніл Сямёнавіч Гілевіч вядомы не толькі як выдатны паэт, вучоны, але і як перакладчык. За пераклады балгарскай літаратуры ўрад НРБ у 1966 годзе ўзнагародзіў Н. С. Гілевіча ордэнам Кірылы і Мяфодзія I ступені.

У 1973 годзе паэт выдаў чарговую анталогію на гэты раз балгарскай класічнай паэзіі «Хай зорыць дзень». З вялікай рэцэнзіяй на гэтую кнігу ў балгарскім часопісе «Язык и литература» (1974, № 2) выступіў вядомы балгарскі русіст, доктар філалагічных навук, прафесар Сімеон Русакіеў. У сваім водзыве прафесар С. Русакіеў піша: «У Беларусі творы балгарскіх паэтаў і пісьменнікаў найбольш актыўна папулярызуе адзін з выдатнейшых прадстаўнікоў сучаснай беларускай мастацкай літаратуры паэт і вучоны Ніл Гілевіч. Трэба зусім пэўна сказаць, што для нас гэтая акалічнасць надзвычай шчаслівая па шэрагу прычын. Ніл Гілевіч — вельмі яркая грамадзянская і творчая індывідуальнасць. Гэта высокаталенавіты паэт, арыгінальны і самабытны ў сваіх творчых уяўленнях, з выразна акрэсленым профілем, шырока эрудзіраваны, выключна працалюбівы і прадуктыўны, які безупынна развіваецца па ўзыходнай лініі.

Сапраўдны патрыёт і інтэрнацыяналіст, ён добра спалучае любоў да сваёй радзімы з павагай да другіх народаў. Гілевіч звязаў свой творчы лёс з Балгарыяй і балгарскай літаратурай. Бываючы ў нас, ён выдатна вывучыў балгарскую мову, грунтоўна пазнаёміўся з нашай літаратурай, з гісторыяй і культурай нашага народа, стаў вялікім, шчырым і глыбока паважаным нашым другам.

Аб вялікай і арганічнай параднёнасці Ніла Гілевіча з Балгарыяй і балгарскай літаратурай сведчаць самі аб'ектыўныя факты. Да цяперашняга часу ён прадставіў балгарскую літаратуру ў Беларусі чатырма анталогіямі — адна з іх складаецца з узораў нашай мастацкай прозы, дзве анталогіі прадстаўляюць нашу паэзію, і яшчэ адна анталогія, у якой падабраны ўзоры балгарскай дзіцячай паэзіі. Ён пераклаў таксама балгарскія народныя песні, асобныя творы многіх нашых сучасных паэтаў і пісьменнікаў, апублікаваў артыкулы аб балгарскай літаратуры ў беларускім перыядычным друку і г. д. Ёсць усе несумненныя падставы гаварыць, што заслугі Ніла Гілевіча ў папулярызацыі балгарскай літаратуры ў Савецкім Саюзе вельмі вялікія. Мы не можам назваць другога савецкага літаратара, які б параўнаўся ў творчай актыўнасці з Гілевічам у адносінах да нашай літаратуры.

І, вядома, гэта канстатацыя не толькі колькасная. Яна можа быць аднесена і да якаснага прадстаўлення балгарскай літаратуры ў Беларусі. Наколькі патрабавальны да сябе Ніл Гілевіч у сваёй арыгінальнай творчай дзейнасці, настолькі патрабавальны ён і пры перакладзе балгарскіх аўтараў».

Сваю рэцэнзію С. Русакіеў заканчвае словамі: «Паэтычная анталогія «Хай зорыць дзень» — гэта чарадзейны мост, які злучае духоўны свет двух брацкіх народаў. Праз анталогію нашы лепшыя паэты спавядаюцца перад сваімі беларускімі чытачамі ў сваіх думках і пачуццях.

Гэтая выдатная анталогія, як і ўся велізарная праца Ніла Гілевіча ў справе папулярызацыі балгарскай літаратуры ў Беларусі, будзіць пачуцці глыбокай падзякі. Але гэта праца выклікае не толькі захапленне і падзяку. Яна і абавязвае».

**В. КАЛАДЗІНСКІ.**

## РАЗВІТАЛІСЯ СЯБРАМІ

Упершыню ехала агітбрыгада факультэта журналістыкі да рабят Сёмкаўскай школы-санаторыя, якія запрасілі студэнтаў выступіць у іх на вечары, прысвечаным Дню Канстытуцыі.

Вельмі шчыра рэагавалі школьнікі на выступленні дэкламатараў, спевакоў, артыстаў тэатра мініяцюр.

Доўга не адпускалі рабяты са сцэны Валодзю Лялеку, Аркадзя Шульмана, Наташу Панамарову.

Доўга гучалі са сцэны песні, вершы, жарты са студэнцкага жыцця. «Прыязджайце да нас яшчэ, калі ласка!» —гаварылі на развітанне школьнікі.

**Л. БАБРОЎСКАЯ.**





*Першы снег.* *Фота В. ДРАЧОВА.*

«Белорусский университет—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

В. а. рэдактара Т. І. САХАШЧЫК.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Заказ № 1639. АТ 23635